# Гістарычны шлях Беларускай совецкай дзяржавы

## П. ПАНАМАРЭНКА

Вялікая Кастрычніцкая соцыялістычная рэволюцыя карэнным чынам змяніла лёс нашай краіны, звергла ўладу памешчыкаў і капіталістаў і ўстанавіла совецкую ўладу. Совецкая ўлада ў першыя-ж дні свайго існавання вырашыла самыя жыццёвыя, самыя насутныя для працоўных Расіі пытанні: адабрала землі ў памешчыкаў і перадала іх у карыстанне сялянам, адабрала сродкі вытворчасці ў буржуазіі і ператварыла фабрыкі, заводы, чыгункі, банкі ва ўласнасць усяго народа.

У выніку перамогі соцыялістычнай рэволюцыі ў нашай краіне ліквідаваны эксплаататарскія класы і пабудаван новы, нябачаны ў гісторыі соцыялістычны грамадскі і дзяржаўны лад. Совецкая ўлада вырвала Расію з путаў імперыялізма, разбіла ланцугі матэрыяльнага і духоўнага заняволення нашай краіны заходнім імперыялізмам, выратавала яе ад прыгатаванага ёй удзелу іншаземнай калоніі, нашых людзей — ад ператварэння ў каланіяльных рабоў.

Совецкая ўлада прынесла нацыянальнае вызваленне ўсім народам Расіі, пабудавала шматнацыянальную соцыялістычную дзяржаву, аснаваную на трывалай дружбе свабодалюбівых і роўнапраўных народаў.

Партыя Леніна—Сталіна, прывёўшы наш народ да перамогі над імперыялізмам, павяла яго па шляху соцыялістычнага будаўніцтва. Іменна таму ў найкарацейшыя гістарычныя тэрміны былі праведзены ў нашай краіне вялікія пераўтварэнні ва ўсіх галінах жыцця.

З таго часу, як трыццаць год назад у нашай краіне пераможна ўзняўся сцяг вялікай рэволюцыі і свет раскалоўся на дзве сістэмы, совецкі народ стаў вестуном вызваленчага руху ўсяго чалавецтва.

Совецкія людзі ператварылі ў жыццё заветныя мары прыгнечаных і абяздоленых—мары аб грамадстве роўнапраўных і свабодных працаўнікоў, даказалі гістарычную асуджанасць загніваючай, раздзіраемай супярэчнасцямі капіталістычнай сістэмы, паказалі веліч магутнай у сваім развіцці сістэмы соцыялістычнай, усялілі ў сэрцы працоўных усіх краін надзею і паказалі ім шлях да вызвалення ад класавага і нацыянальнага прыгнечання.

Ленінізм, правераны гістарычным вопытам мільёнаў, яднае пад сваім сцягам усё новых і новых старроннікаў ва ўсіх краінах свету. Яго ідэі ўсё глыбей западаюць у свядомасць працоўных мас капіталістычнага свету, якія змагаюцца за сваё вызваленне.

Многа раз ядналіся сілы старога свету, каб задушыць соцыялістычную дзяржаву рабочых і сялян. Многа раз за мінулыя трыццаць год яны прадвяшчалі блізкую пагібель совецкай улады. Але гінула не совецкая ўлада, а яе ворагі.

Кіруемыя выпрабаванай і загартаванай у класавых бітвах партыяй большэвікоў, рабочыя і сяляне адстаялі совецкі лад у цяжкія гады ваеннай інтэрвенцыі і грамадзянскай вайны, калі полчышчы іншаземных інтэрвентаў і белагвардзейскай контррэволюцыі з усіх бакоў насядалі на маладую совецкую рэспубліку. І ў далейшыя гады ўсе намаганні іншаземных імперыялістаў, унутраных сіл контррэволюцыі і іх агентуры—трац-

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

кістаў, зіноўеўцаў, бухарынцаў, буржуазных нацыяналістаў, якія імкнуліся аднавіць у нашай краіне капіталізм і ператварыць яе ў калонію, — разбіліся аб несакрушальную магутнасць совецкага народа. Совецкі народ з чэсцю вышаў з самага цяжкага выпрабавання, якім была для нашай краіны Айчынная вайна з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Каварны вораг быў поўнасцю разгромлен.

Усімі сваімі дасягненнямі, у корані пераўтварыўшымі нашу краіну, Совецкі Саюз абавязан сваёй роднай партыі большэвікоў, вялікаму правадыру і любімаму настаўніку — таварышу Сталіну.

Совецкі народ дабіўся сусветна-гістарычных перамог таму, што ім кіруе слаўная большэвіцкая партыя, створаная Леніным і Сталіным. Следуючы ўсеперамагаючаму вучэнню Маркса — Энгельса — Леніна — Сталіна, партыя большэвікоў указала пролетарыяту і ўсім працоўным Расіі шлях да вызвалення. Цвёрда і ўпэўнена вяла большэвіцкая партыя рабочых і сялян на штурм капіталізма і пабудову соцыялізма. Сваёй мудрай стратэгіяй, гібкай тактыкай, кіпучай рэволюцыйнай дзейнасцю большэвіцкая партыя перамагла ўсе перашкоды на шляху да перамогі соцыялізма.

Слаўнае трыццацігоддзе совецкай дзяржавы з'яўляецца яркай дэманстрацыяй вялікай сілы большэвіцкай партыі і трыумфу бяссмертных ідэй Маркса — Энгельса — Леніна — Сталіна.

* * *

За 30 год совецкай улады наша краіна з адсталай аграрнай царскай Расіі ператворана ў перадавую незалежную соцыялістычную дзяржаву, у магутную дзяржаву з высокаразвітай соцыялістычнай індустрыяй і буйнай соцыялістычнай сельскай гаспадаркай.

Дарэволюцыйная Расія ў тэхніка-эканамічных адносінах на цэлае стагоддзе адставала ад перадавых капіталістычных краін. Каб дабіцца перамогі соцыялізма, трэба было перш за ўсё стварыць магутную перадавую індустрыю. Толькі гэта забяспечвала эканамічную самастойнасць нашай краіны і магло стварыць матэрыяльную базу для соцыялістычнай рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі.

Владзімір Ільіч Ленін гаварыў:

«Рэволюцыя зрабіла тое, што ў некалькі месяцаў Расія па свайму *палітычнаму* ладу дагнала перадавыя краіны.

Але гэтага мала. Вайна няўмольна, яна ставіць пытанне з бязлітаснай рэзкасцю: або загінуць, або дагнаць перадавыя краіны і перагнаць іх таксама *і эканамічна*.

... Загінуць або на ўсіх парах паімкнуцца ўперад. Так пастаўлена пытанне гісторыяй» (Ленін, т. XXI, стар. 191, выд. 3-е).

Апіраючыся на ўказанні В. І. Леніна, таварыш Сталін распрацаваў праграму соцыялістычнай індустрыялізацыі краіны.

Гістарычныя ўмовы існавання і развіцця совецкай краіны дыктавалі неабходнасць высокіх тэмпаў будаўніцтва цяжкай індустрыі. Таварыш Сталін вучыў совецкіх людзей: «Затрымаць тэмпы—гэта значыць адстаць, а адсталых б'юць».

Большэвіцкая партыя і совецкі народ перамаглі і разграмілі ворагаў усіх масцей, якія імкнуліся затрымаць і сарваць індустрыялізацыю, ператварыць нашу краіну ў аграрны прыдатак капіталістычных краін і тым асудзіць яе на адставанне, пазбавіць магчымасці арганізаваць рашучы адпор у выпадку ваеннага нападу звонку.

Зараз ясна ўсім, што калі-б совецкая дзяржава не разгарнула хуткімі тэмпамі будаўніцтва цяжкай індустрыі, яна страціла-б сваю самастойнасць і стала-б забаўкай у руках імперыялістычных сіл.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Совецкая дзяржава правяла індустрыялізацыю краіны, апіраючыся на свае ўнутраныя рэсурсы. Калі ў капіталістычных краінах індустрыялізацыя, якая праводзілася за кошт рабунку і бязлітаснай эксплаатацыі калоній, заўсёды цягнула за сабой масавую галечу працоўных і рост беспрацоўя, то індустрыялізацыя совецкай краіны прывяла да поўнай і канчатковай ліквідацыі беспрацоўя ў СССР, да няўхільнага палепшання матэрыяльнага добрабыту і ўздыму культурнага ўзроўню насельніцтва.

Мільёны совецкіх людзей, не шкадуючы сіл, самаадданай працай узводзілі велічны будынак пяцігодак. Працоўны гераізм і самаадданасць мільённых мас рабочага класа былі бяспрыкладны. Ужо к 1937 году 80% усёй прамысловай прадукцыі выпускалася на прадпрыемствах, пабудаваных або цалкам рэканструяваных за першую і другую пяцігодкі, каля 90% усіх працаваўшых у сельскай гаспадарцы трактараў і камбайнаў былі выпушчаны совецкай прамысловасцю ў другой пяцігодцы. К 1940 году быў у 12 раз перавышаны ўзровень прамысловай вытворчасці 1913 года.

У выніку такіх тэмпаў развіцця прамысловасці Совецкі Саюз ліквідаваў стогадовую прамысловую адсталасць Расіі, абагнаў па аб'ёму прамысловай вытворчасці ўсе краіны Еўропы на працягу ўсяго 13 год. Гэта — трыумф ленінска-сталінскай палітыкі індустрыялізацыі СССР.

«Такі небывалы рост вытворчасці,—гаварыў таварыш Сталін,—нельга лічыць простым і звычайным развіццём краіны ад адсталасці к прагрэсу. Гэта быў скачок, пры дапамозе якога наша Радзіма ператварылася з адсталай краіны ў перадавую, з аграрнай у індустрыяльную».

Велізарны шлях індустрыяльнага развіцця прайшлі за гэты час рэспублікі, у мінулым адстаўшыя ў прамысловым развіцці.

Таварыш Сталін вучыў, што прававая, нацыянальная роўнасць народаў Совецкага Саюза, здабытая Кастрычніцкай рэволюцыяй, з'яўляецца вялікай заваёвай, але сама па сабе не можа вырашыць нацыянальнага пытання, калі пры гэтым не ліквідаваць фактычную гаспадарчую і культурную няроўнасць, якая крыецца не толькі ў гісторыі народаў, але і ў палітыцы царызма і рускай буржуазіі. Таварыш Сталін гаварыў аб тым, што гэта — працяглы працэс, які патрабуе ўпартай і настойлівай работы, сапраўднай і працяглай дапамогі рускага пролетарыята адсталым народам у справе іх гаспадарчага і культурнага росту. Таму ў палітыцы індустрыялізацыі краіны таварыш Сталін асаблівую ўвагу ўдзяліў пытанню ўздыму эканомікі і культуры адсталых у мінулым нацыянальных ускраін.

На Беларусі, якая ў мінулым мела слабую, адсталую, галоўным чынам саматужную прамысловасць, у гады індустрыялізацыі былі створаны машынабудаўнічая, аўтарамонтная, цэментная, хімічная, гідролізная і многія іншыя галіны прамысловасці, аб якіх не магла і марыць дарэволюцыйная Беларусь.

Аб тэмпах індустрыялізацыі БССР можна меркаваць па таму, што сярэднегадовы прырост яе прамысловай прадукцыі за першую пяцігодку склаў 48,2% супроць 21,6% сярэднегадовага прыросту па цэнзавай прамысловасці ўсяго Саюза. Для характарыстыкі маштабаў і значэння прамысловай вытворчасці можна ўказаць, што толькі за чатыры перадваенныя гады станкабудаўнічыя заводы БССР выпусцілі 21 тысячу металарэжучых станкоў, а завод «Гомсельмаш» даў 144 тысячы сартыровак, 12 тысяч малатарань і звыш 9 тысяч іншых сельскагаспадарчых машын.

Узніклі сотні новых прадпрыемстваў, якія выпускалі прадметы шырокага спажывання. У 1940 годзе аб'ём прадукцыі харчова-смакавай прамысловасці перавышаў аб'ём усёй прамысловай вытворчасці 1913 г. у 5,7 раза, скуранаабутковай—у 1,7, малочнай—у 4, дрэваапрацоўчай—

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

у 1,7 раза. У 1940 годзе прамысловасць Беларусі вырабляла прадукцыі на душу насельніцтва ў параўнанні з 1913 годам; электраэнергіі ў 96 раз, кандзіцерскіх вырабаў—у 254 разы, абутку—у 23 разы, кансерваў—у 12 раз, металавырабаў—у 30 раз больш. У 1940 г. прадукцыя прамысловасці ўсходніх абласцей вырасла амаль у 23 разы супроць 1913 г., а ў заходніх абласцях за паўтара гады з часу іх уваходжання ў склад БССР аб'ём прамысловай вытворчасці амаль падвоіўся.

Удзельная вага прадукцыі БССР у агульным аб'ёме прамысловай вытворчасці СССР вырасла ў 2,44 раза.

За гады сталінскіх пяцігодак Совецкі Саюз паспяхова вырашыў самую цяжкую пасля перамогі рэволюцыі задачу—задачу соцыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі.

Сотні год сяляне Расіі цягнулі жабрацкае існаванне, гнулі спіну, працуючы на памешчыкаў і кулакоў. Галеча і бескультур'е былі ўдзелам мільённых мас сялянства. Дзякуючы ажыццяўленню сталінскай палітыкі калектывізацыі, дробныя, адсталыя сялянскія гаспадаркі былі пераўтвораны ў самую буйную ў свеце соцыялістычную сельскую гаспадарку, аснаваную на шырокім прымяненні перадавой навукі і тэхнікі. Партыя большэвікоў і совецкая дзяржава вывелі сялянства на новую дарогу. Совецкае сялянства канчаткова і беспаваротна стала на шлях соцыялізма. Кулацтва—самы шматлікі эксплаататарскі клас у нашай краіне—было ліквідавана. Калектывізацыя сельскай гаспадаркі падарвала апошнюю крыніцу капіталістычнай рэстаўрацыі. Гэта быў, як указваў таварыш Сталін, «... найглыбейшы рэволюцыйны пераварот, скачок з старога якаснага стану грамадства ў новы якасны стан, роўназначны па сваіх выніках рэволюцыйнаму перавароту ў кастрычніку 1917 года» (Кароткі курс гісторыі ВКП(б), стар. 291).

Калектывізацыя сельскай гаспадаркі забяспечыла нябывалы рост сельскагаспадарчай вытворчасці, велізарны ўздым матэрыяльнага дабрабыту і культурнага ўзроўню совецкага сялянства.

Беларускае сялянства ў мінулым знаходзілася пад жорсткім палітычным, эканамічным і нацыянальным уціскам царызма, бязлітасна эксплаатавалася рускімі, польскімі і беларускімі памешчыкамі і капіталістамі і ў большасці сваёй было пазбаўлена зямлі. У дарэволюцыйнай Беларусі 4 тысячы памешчыкаў уладалі 66,5% усёй зямлі, а 664 тысячы сялянскіх двароў мелі толькі 33,5% і прытым горшай зямлі. Беззямелле і малазямелле, непасільныя падаткі, зверская эксплаатацыя з боку памешчыкаў і кулакоў абумовілі экстэнсіўнасць сельскай гаспадаркі. Беларускаму селяніну заўсёды нехапала зямлі, часта недаставала насення, коней, інвентара. Пераважнай большасці сялян ніколі нехапала свайго хлеба да новага ўраджаю, лебяда і мякіна былі звычайным прыдаткам да хлеба.

«Селянін,—пісаў Ленін,—быў давезен да жабрацкага ўзроўню жыцця: ён змяшчаўся разам з жывёлай, апранаўся ў рыззё, карміўся лебядой... Сяляне галадалі хранічна, і дзесяткамі тысяч паміралі ад голаду і эпідэмій у час неўраджаяў, якія паўтараліся ўсё часцей і часцей» (Ленін, т. IV, стар. 101—102, выд. 3-е).

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы